# ТВОРЫ СТУДЭНТАЎ ПАД ВОКЛАДКАЙ

У выдавецтве Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў выйшаў другі выпуск мастацка-публіцыстычнага альманаха “Альфабэт”. Пад агульнай вокладкай сабраныя творы студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта. Такі сімбіёз невыпадковы – сярод насельнікаў навучальнай установы шмат цікавых і творчых асоб.

Першы выпуск часопіса рэдагавала знакамітая беларуская паэтка і рэдактар Ніна Загорская. Другі ж выпуск “Альфабэта” ў свае рукі ўзялі прафесар, доктар мастацтвазнаўства Анатоль Сабалеўскі ды яго студэнты з 509 групы. Групы, якая рыхтуе літаратурных работнікаў – драматургаў. Але, на жаль, набор на гэтую спецыяльнасць ужо прыпынены.

Узгадаем гісторыю стварэння альманаха. Прычым зробім гэта са спасылкай на словы Анатоля Сабалеўскага ў прадмове да другога выпуска.

“У 2004 г. выйшаў першы выпуск літаратурна-мастацкага альманаха «Альфабэт». Ініцыятарам гэтага выдання, як і аўтарам яго назвы, быў знаны драматург, публіцыст і празаік Алесь Петрашкевіч. Збор матэрыялаў і падрыхтоўка іх да друку доўжыліся даволі працяглы час: звычайная рэч – першае літаратурнае дзіця бывае не толькі радасным, а і цяжкім.

Калі па стане здароўя пакінуў працу Алесь Петрашкевіч, які быў мастацкім кіраўніком курса спецыялізацыі «Драматургія» ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, – ён, да слова, і першы рэктар гэтай навучальнай установы (тады Мінскага інстытута культуры), – за рэалізацыю задумы вельмі энергічна ўзялася вядомая паэтка і рэдактар, дацэнт Ніна Загорская. Яна, актыўна далучыўшы да справы сваіх выхаванцаў па спецыялізацыі «Тэлерадыёдраматургія», давяла альманах да выпуску ў свет.

Ніна Загорская ва ўступным артыкуле «Ад галоўнага рэдактара» прывяла факты найбольш значных поспехаў і набыткаў выпускнікоў і студэнтаў




спецыяльнасці «Літаратурная работа» (спецыялізацыі «Драматургія», «Кінадраматургія», «Тэлерадыёдраматургія») – падрыхтоўка студэнтаў распачалася на кафедры тэатральнай творчасці з 1994 г., – адназначаных прызнаннем і ўзнагародамі ў нашай краіне і ў замежжы. Дык вось, здавалася б, сухі, бясстрасны пералік, – дзякуй аўтару за дакументальны летапіс, – па-сапраўднаму ўражвае як сваёй колькасцю, так і ацэнкамі аўтарытэтаў.

За параўнальна кароткі прамежак часу паміж першым і другім выпускамі літаратурныя набыткі выхаванцаў і настаўнікаў БДУ культуры і мастацтваў значна памножыліся і ўзбагаціліся.

У альманаху прадстаўлены фактычна ўсе роды літаратуры – паэзія, проза, драматургія, крытыка. Але першае і найбольшае месца адведзена драматургіі, што ўвогуле заканамерна. Універсітэт жа рыхтуе розных профіляў драматургаў, хоць яго студэнты і выпускнікі, што таксама натуральна і заканамерна, нярэдка выступаюць і ў галіне прозы, паэзіі, крытыкі, пішуць навуковыя даследаванні.

Побач з асноўнымі традыцыйнымі раздзеламі ўводзяцца і новыя. Гэта «З драматургічнай майстэрні», дзе зроблена спроба паказаць шляхі і прыёмы працы з літаратурным творам і шырэй – хоць крышачку зазірнуць у таямніцу творчасці абранага профілю, і «Даследаванні. Крытыка». У апошнія гады, улічваючы патрабаванні да выпускнікоў па будучай працы, узмоцнена ўвага на «выкоўванне» ў іх крытыка-аналітычнай думкі. Студэнты на практычных занятках па крытыцы, па іншых прадметах, дзе вядзецца аналіз мастацкай творчасці, займаюцца ахвотна, з сапраўдным зацікаўленнем. І калі раней у якасці дыпломных прац прадастаўляліся выключна драматургічныя творы ці сцэнізацыі, дык цяпер выносяць на абарону і навуковыя даследаванні. Гэтыя змены не маглі не знайсці адлюстравання ў новым літаратурна-мастацкім выданні.

Прапануем вашай увазе некаторыя творы з новага, другога выпуска “Альфабэта”.

**Зміцер КАРМАЗІН**